Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы прарэктар БДУКМ
______________А. А. Корбут
«____»_______________2016 г.
Рэгістрацыйны № ВД-___/вуч.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# СТАНАЎЛЕННЕ І РАЗВІЦЦЁ БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРАЛОГІІ ЯК НАВУКІ І ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

*Вучэбная праграма па спецыяльнасці*
*1-21 80 13 Культуралогія*

2016

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандарта ОСВО 1-21 80 13-2012 Культуралогія і вучэбнага плана па спецыяльнасці1-21 80 13 Культуралогія, рэг. № Д 21-2-02/вуч. ад 29.08.2012 г.

**СКЛАДАЛЬНІК**

*А. І. Смолік,* загадчык кафедры культуралогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», доктар культуралогіі, прафесар

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

*І. І. Бадунова,* кандыдат культуралогіі, старшы выкладчык кафедры харэаграфіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

*кафедрай* культуралогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 11 ад 18.05.2016 г.);

*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол №5 ад 18.06.2016 г.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адказны за рэдакцыю: А. А. Ляўкевіч
Адказны за выпуск:А. І. Смолік

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Айчынная культуралогія як навука аб культуры толькі ў апошнім дзесяцігоддзі XX ст. набыла статус гуманітарнай дысцыпліны, але за гэты час дасягнула сталага ўзроўню развіцця і ўжо набыла пэўную сістэмнасць, якая дазваляе прэтэндаваць на асэнсаванне шэрагу праблем, да гэтага часу глыбока неасвечаных у сумежных навуках.

Сучасныя культуралагічныя даследаванні дазваляюць больш глыбока ўспрымаць уласную культуру і ўласцівы ёй тып чалавека, зразумець іх гістарычныя і культурныя межы. Цікавасць да культуралогіі абумоўлена таксама зменай сацыяльных стымулаў на культурныя. Сацыяльныя змены ўсё больш атрымліваюць культурную матывацыю.У XXI ст. назіраецца імклівае нарастанне тэарэтычных і прыкладных культуралагічных даследаванняў.

Прафесарамі і дацэнтамі беларускай вышэйшай школы апублікаваны грунтоўныя манаграфіі, у якіх аналізуюцца ключавыя праблемы сацыядынамікі айчыннай і сусветнай культуры. У Беларусі навукоўцамі выдадзена пэўная колькасць вучэбна-метадычнай літаратуры па тэорыі і гісторыі культуры. Асобным вучэбна-метадычным дапаможнікам нададзены грыф «Дапушчана Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь у якасці вучэбнага дапаможніка для студэнтаў устаноў, якія забяспечваюць атрыманне вышэйшай адукацыі».

*Мэтай* вучэбнай дысцыпліны «Станаўленне і развіццё беларускай культуралогіі як навукі і вучэбнай дысцыпліны» з'яўляецца выяўленне культуралагічнага дыскурсу ў беларускіх літаратурных тэкстах, на падставе якога адбывалася станаўленне і развіццё айчыннай культуралогіі.

Падчас выкладання дадзенай вучэбнай дысцыпліны вырашаюцца наступныя *задачы:*

– абгрунтаванне тэзіса аб існаванні ў Беларусі самастойнай паўнавартаснай навукі аб культуры;

– раскрыццё разнастайнасці трактовак цэнтральнага для культуралогіі паняцця «культура» на розных гістарычных этапах развіцця грамадскай думкі;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– выяўленне культуралагічных ідэй і канцэпцый, якія фарміраваліся ў працэсе рэфлексіі прадстаўнікамі беларускіх грамадскіх навук;

– назапашванне магістрантамі тэарэтычных ведаў, неабходных для апісання культуралагічных інтэнцый у беларускай сацыягуманітарнай спадчыне.

У выніку засваення тэм вучэбнай дысцыпліны магістрант павінен *ведаць:*

– змест і сутнасць навуковых падыходаў да тлумачэння таго, як і чаму адбывалася станаўленне і развіццё імпліцытных культуралагічных ведаў;

– асноўныя культуралагічныя канцэпцыі і парадыгмы, якія ўзніклі ў пэўны перыяд у беларускай гуманітарыстыцы;

– дэтэрмінанты фарміравання эксплiцытных культуралагічных ведаў;

– персаналіі айчыннай культуралогіі і іх унёсак у развіццё беларускай культуралагічнай думкі;

– кірункі сучасных культуралагічных даследаванняў.

Магістрант павінен *умець:*

– аналізаваць знешнія і ўнутраныя фактары станаўлення і развіцця беларускай культуралагічнай думкі;

– выяўляць культуралагічны дыскурс у сацыягуманітарнай спадчыне;

– вызначаць культуралагічную сутнасць, змест і сэнс розных літаратурных тэкстаў;

– даследаваць асноўныя тэарэтыка-метадалагічныя працы беларускіх культуролагаў;

– выкарыстоўваць метадалогію айчынных культуролагаў у сваёй навукова-даследчай дзейнасці.

Магістр павінен валодаць наступнымі кампетэнцыямі:

АК-4. Падрыхтаванасць да стварэннякультурнага, сацыяльнага і педагагічнагапраектаваннясацыякультурнайдзейнасці.

АК-5. Навыкі і ўменніпабудовынайбольшэфектыўныхмадэлейвучэбна-выхаваўчагапрацэсу з мэтайсамаактуалізацыі і самарэалізацыісуб’ектаў культуры.

САК-3. Быцьздольным да супрацоўніцтва і работы ў камандзе.

САК-4. Камунікатыўнымі здольнасцямі для работы ў міждысцыплінарным і міжнародным асяроддзі.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

САК-8. Успрымаць і пераасэнсоўваць каштоўнасці, нормы, артэфакты культуры іншых супольнасцей.

ПК-2. Складаць планы і праграмыдаследаванняў па асноўныхпраблемахсацыядынамікі культуры.

ПК-3. Збіраць, аналізаваць і сістэматызавацьтэарэтычны і эксперыментальныматэрыял.

ПК-4. Распрацоўвацьметодыкусацыялагічныхдаследаванняў, апрацоўвацьматэрыялы і на іхасноверабіцьнавуковаабгрунтаваныявысновы.

ПК-5. Рыхтавацьнавуковыяартыкулы ў рэцэнзуемыячасопісы, даклады на навуковыяканферэнцыі.

ПК-15. Рацыянальнавыкарыстоўвацьсучасныяпрынцыпы, метады, формы, сродкі і механізмыкіраваннясферай культуры.

ПК-17.Прагназаваць, планаваць і ажыццяўляцьінавацыйнаметадычную і мастацка-творчуюдзейнасцьустаноў культуры і мастацтва.

Вучэбным планам на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Станаўленне і развіццё беларускай культуралогіі як навукі і вучэбнай дысцыпліны» ўсяго прадугледжваецца 66 гадзін, з якіх 32 – аўдыторныя гадзіны (16 – лекцыйныя, 16 – практычныя заняткі). Рэкамендаваная форма кантролю – залік.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## Уводзіны

Значэнне дысцыпліны «Станаўленне і развіццё беларускай культуралогіі як навукі і вучэбнай дысцыпліны» ў падрыхтоўцы культуралагічных кадраў. Прадмет, змест, мэта і задачы, структура вучэбнага курса. Міждысцыплінарныя сувязі дадзенай дысцыпліны. Віды вучэбных заняткаў. Крыніцы інфармацыі па праблематыцы вучэбнай дысцыпліны. Формы кантролю.

Характарыстыка асноўных катэгорый айчыннай культуралогіі як навукі аб культуры. Беларуская культура як сукупнасць матэрыяльных, духоўных і сацыяльных каштоўнасцей. Паняцці «імпліцытныя» і «эксплiцытныя» культуралагічныя веды. Дыскурсіўны аналіз і яго сутнасць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тэма 1. Гістарычныя і сацыяльныя перадумовы станаўлення імпліцытных ведаў аб культуры

Культурны вопыт старажытнаславянскіх народаў як крыніца асэнсавання аб'ектыўнай ісціны ў галіне духоўнага асваення рэчаіснасці. Уплыў на працэс фарміравання імпліцытных культуралагічных ведаў антычных мысліцеляў. Пранікненне маральнага пафасу хрысціянскага гуманізму ў светапогляд беларускіх мысліцеляў Сярэдніх вякоў (Е. Полацкая, К. Тураўскі, А. Смаленскі, К. Смаляціч і інш.).

Інтэрпрэтацыя ідэі гуманізму і гістарызму ў творчай спадчыне айчынных мысліцеляў эпохі Адраджэння. Філасофска-этычныя погляды Ф. Скарыны. Натуралістычная інтэрпрэтацыя С. Будным традыцыйнай хрысціянскай дактрыны. Талерантнасць і рацыяналізм В. Цяпінскага. Рэнесансава-ўтапічная канцэпцыя М. Гусоўскага. Эксплікацыя сутнасці інкультурацыі Л. Зізаніем і М. Сматрыцкім.

Увасабленне ідэалу свабоды суб'екта культуры ў творах беларускіх філосафаў (А. Волан, М. Літвін, Я. Намыслоўскі, С. Рысінскі).

## Тэма 2. Пераасэнсаванне сутнасці культуры мысліцелямі Беларусі ў XVII–XVIII стст.

Культурасофія прадстаўнікоў Асветніцтва як падмурак культуралагічных ведаў айчынных мысліцеляў.Абгрунтаванне ідэі навуковага гістарызму ў творах К. Вырвіча («Паходжанне сучасных дзяржаў і народаў»). Лука Залускі аб прыярытэце навукі пра чалавека і гуманістычным ідэале навукі («Агульная філасофія», «Практычная філасофія», «Тэарэтычная філасофія»). Тэарэтычныя асновы этыкі Язэпа Даманеўскага («Жыццё сельскае і гарадское», «Некаторыя эмблемы»). Лагічныя, метафізічныя і натуралістычныя аксіёмы розуму ў працах Андрэя Вішаватага («Аб рэлігіі, згоднай з розумам»). Адлюстраванне рэнесансавых і асветніцкіх ідэалаў у трактаце Казіміра Лышчынскага «Аб неіснаванні Бога».

Гомацэнтрычны светапогляд Сімяона Полацкага (казанне «Слова ў дзень Новага лета»). Інтэрпрэтацыя хрысціянскіх духоўных каштоўнасцей С. Полацкім. Экуменістычныя погляды С. Полацкага. Трактоўка хрысціянскай сімволікі ў працах С. Полацкага («Абед душэўны», «Вячэра душэўная»). Уклад С. Полацкага ў фарміраванне самабытнага ўсходняга тыпу барочнай культуры. Рэлігійна-хрысціянская эстэтычная канцэпцыя прыгожага і мастацтва С. Полацкага («Слова да шчырага іконнага пісання»).

## Тэма 3.Узнікненне новых навуковых галін даследавання беларускай культуры ў XIX – пач. XX ст.

Перадумовы станаўлення эксплiцытных ведаў аб культуры. Змена арыенціраў пазнання: эмпірызм і рацыяналізм як аснова пазнання; рэабілітацыя розуму І. Кантам; новая трактоўка культуры Ф. Гумбальтам; этнаграфічнае паняцце культуры; лінейна-прагрэсіўная парадыгма культуры; рамантычна-паэтычнае ўспрыманне жыцця і інш. Ажыўленне навуковага і грамадска-палітычнага жыцця ў Беларусі ў першай палове XIX ст.

Увасабленне аб’ектаў беларускай народнай культуры ў творчасці А. Міцкевіча, Я. Чачота, Т. Зана.

Глыбокі гуманізм, патрыятызм і свабода як фундаментальныя каштоўнасці беларускай культуры (паводле К. Каліноўскага). Абгрунтаванне ідэі талерантнасці Ф. Савічам («Прынцыпы дэмакратызму», «Успаміны»). Канцэпцыяпаслядоўнага і па-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ступовага развіцця цывілізацыі Мацвея Лавіцкага («Погляд на хрысціянскі свет», «Варыяцыі»).

Увасабленне ідэі гарманічных узаемасувязей у галіне культуры, маралі, нацыянальнага жыцця прадстаўнікамі культурна-асветніцкай плыні (В. Дунін-Марцынкевіч, Я. Лучына, Ф. Багушэвіч, Э. Пашкевіч, Я. Колас, Я. Купала і інш.).

Комплекснае параўнальна-гістарычнае даследаванне гісторыі беларускай мовы і літаратуры, дыялекталогіі, фальклору беларусаў Я. Ф. Карскім («Беларусы»,1–3 тт.).

Адлюстраванне этнаграфічнай асаблівасці суб’ектаў беларускай культуры ў працах П.В. Баброўскага («Матэрыялы для геаграфіі і статыстыкі Расіі, сабраныя афіцэрамі Генеральнага штаба Гродзенскай губерніі»), А.Я. Багдановіча («Этнічны склад народаў славянскіх і рускіх»), А.Г. Кіркора («Этнаграфічны погляд на Віленскую губерню», «Беларускае Палессе», «Літоўскае Палессе»), К.П. Тышкевіча («Вілія і яе бераг»), Я. П. Тышкевіча («Апісанне Барысаўскага павета: статыстычнае, гаспадарчае, прамыслова-гандлёвае»), М.Я. Нікіфароўскага («Этнаграфічныя звесткі») і інш.

Фальклорна-этнаграфічныя даследаванні П.А. Бяссонава («Беларускія песні»), У.М. Дабравольскага («Прыказка і загадка»), І.І. Насовіча («Легенды, паданні, быліны, байкі, анекдоты»), А.К. Сержпутоўскага(«Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў»), М. Федароўскага («Люд беларускі»), П.М. Шпілеўскага («Беларускія народныя павер’і»), П.В. Шэйна («Беларускія народныя песні») і інш.

## Тэма 4.Фарміраванне эксплiцытных культуралагічных ведаў у першай палове XX ст.

Развіццё айчыннай культуралагічнай думкі ідэолагамі нацыянальна-культурнага адраджэння. Сацыякультурная канцэпцыя І.У. Канчэўскага (Абдзіраловіча) у філасофскім эсэ «Адвечным шляхам: Даследзіны беларускага светапогляду»: адметнасці культурагенезу беларусаў; дзяржаўная незалежнасць як агульначалавечы ідэал; беларуская сацыяльна-эканамічная ідэя. Праблемы нацыянальна-культурнага адраджэння ў працах А. І. Цвікевіча: адметнасці фарміравання грамадска-палітычнай думкі ў Беларусі; станаўленне самасвядомасці і развіццё дзяржаўнасці беларускага народа. Распрацоўка М.Багдановічам шэрагу метадалагічных і культурна-гістарычных пытанняў

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

спадчыны беларусаў. Вызначэнне ролі праваслаўнай, каталіцкай і ўніяцкай цэркваў у духоўным жыцці беларускага народа. Абгрутаванне М. Багдановічам ключавых паняццяў нацыянальна-культурнага развіцця ў працы «Беларускае адраджэнне»: «беларуская культура», «беларускі народ», «беларуская нацыя», «беларуская мова», «нацыянальная свядомасць» і інш. Канцэпцыя адкрытасці беларускай культуры і выяўленне ўплыву на дынаміку беларускай культуры знешніх дэтэрмінантаў.

Тэарэтычнае абгрунтаванне грамадскага прызначэння беларускай культуры М.І. Гарэцкім («Гісторыя беларускай літаратуры»). Акрэсленне праблем духоўнага сталення беларускай нацыі, глыбінных гісторыка-культурных патэнцый беларускага народа («Развагі і думы», «Наш тэатр»). Вызначэнне М. Гарэцкім звышзадачы беларускіх культурна-адраджэнскіх сіл. Культуратворчая дзейнасць М. Гарэцкага.

Ідэя няспыннага адухаўлення быцця ў філасофіі культуры М. А. Лоскага. Узаемадносіны індывіда і культуры паводле канцэпцыі «рэальнага ідэалізму». Крытычныя адносіны Лоскага да нацыянальна-культурнай самастойнасці беларусаў.

Асэнсаванне першавытокаў беларускай культуры, спасціжэнне яе самабытнага характару, сутнасці этнанацыянальнага духу, месца і ролі інтэлігенцыі і сялянства як суб’ектаў культуры ў грамадскім працэсе Я. Коласам і Я. Купалам («Вера і нацыянальнасць», «Справа незалежнасці за мінулы год» і інш.). Разуменне беларускай мовы як асноўнага выніку і сродку культуры, матэрыялізаванага думання, выяўлення ступені развіцця нацыі («Методыка роднай мовы», «Ці маем мы права выракацца роднай мовы»).

Роля Інстытута беларускай культуры ў станаўленні айчыннай культуралагічнай думкі (1922–1929 гг.). Навуковая дзейнасць Я.Ю. Лёсіка, С.М. Некрашэвіча, М. М. Шчакаціхіна і інш.

## Тэма 5. Фудаментальныядаследаванні артэфактаў беларускай культуры ў апошняй чвэрці XX ст.

Культуралогія – аснова гуманітарнага пазнання ў XX ст. Інтэрпрэтацыя паняцця «культура» як метакатэгорыі сучасных сацыяльна-гуманітарных навук беларускімі культуролагамі (Я. М. Бабосаў, Э.К. Дарашэвіч, М.І. Крукоўскі, У.М. Конан,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

М.А. Мажэйка, А.С. Майхровіч, С.А. Падокшын, В.С. Сцёпін і інш.). Вызначэнне ролі культуры ў фарміраванні і творчай самарэалізацыі асобы.

Даследаванне глыбінных працэсаў пераемнасці, змен, узбагачэння духоўных асноў беларускага грамадства супрацоўнікамі акадэмічных інстытутаў. Сістэмнае вывучэнне гісторыі культуры навукоўцамі Інстытута гісторыі АН БССР (У. Д. Будзько, Э.М. Загарульскі, А.Г. Калечыц, П.Ф. Лысенка, А.Р. Мітрафанаў, К.М. Палікарповіч, Л.Д. Побаль і інш.).

Распрацоўка актуальных праблем тэорыі і гісторыі мастацкай культуры ў Інстытуце мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору (В.К. Бандарчык, Л.Н. Дробаў, З.Я. Мажэйка, М. С. Кацар, А.С. Фядосік, М.М. Яніцкая і інш.).

Інтэрпрэтацыя літаратурных тэкстаў як культурнай прасторы беларускімі літаратуразнаўцамі (У.В.Гніламёдаў, В. П. Жураўлёў, В.А. Каваленка, А.І. Мальдзіс, М.М. Мушынскі, М.А. Тычына, Т.І. Шамякіна і інш.).

Выяўленне ўзаемасувязі і ўзаемадзеяння беларускай мовы і культуры мовазнаўцамі (А.І. Падлужны, М.Р. Суднік, Ф. М. Янкоўскі, М.С. Яўневіч і інш.).

## Тэма 6.Развіццё навуковага патэнцыялу сучаснай беларускай культуралагічнай школы

Тэарэтыка-метадалагічныя праблемы культуры і іх аналіз у беларускай культуралогіі (І.В.Марозаў, У.Ф. Мартынаў, А. А. Павільч, А.І. Смолік і інш.).

Асэнсаванне праблем сацыядынамікі беларускай культуры як адзін з кірункаў айчыннай культуралогіі XXI ст. (У. А. Жылко, В.У. Сашчэка, А.Э. Салікаў, У.П. Скараходаў і інш.).

Працэсы субкультуралізацыі беларускага грамадства і іх даследаванне айчыннымі культуролагамі (В.Л. Гуцько, С.У. Масленчанка, Т.Л. Ойстрах-Дзямідава, Т.М. Смолікава).

Аналіз дэтэрмінантаў крызісу культуры ў працах беларускіх культуролагаў (Л.К. Кухто, У.Ф. Мартынаў, Д.А. Смолік, Э. А. Усоўская і інш.).

Вызначэнне канцэптуальных асноў камунікатыўнай практыкі культуролагамі Рэспублікі Беларусь (В.У. Валашок, А. А. Спірына (Крыштаносава), С.У. Данскіх).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Культурная спадчына Беларусі як аб’ект культуралагічных даследаванняў (Л.С. Кажухоўская, В.В. Калацэй, С.К. Канановіч, С.А. Пацыенка, Ю.В. Чарняўская, Н. Я. Шалупенка і інш.).

Працэсы інкультурацыі і сацыялізацыі асобы і іх адлюстраванне ў айчыннай культуралогіі (І.М. Вeconановіч, С.Л. Вілейка, А. С. Зубра, Т. В. Карнажыцкая, А. А. Каспярук, А. І. Сцепанцоў, Т.І. Якавук і інш.).

Узаемадзеянне рэлігіі і культуры – найважнейшы аспект культуралагічных даследаванняў (Ю.В. Аленькова, Н.А. Валковіч, І.У. Вараб’ёва, А.А. Гарбацкі, І.Л. Коган, А.А. Суша, Г.С. Мартысевіч і інш.).

Тэарэтыка-культуралагічны аналіз тэкстаў мастацкай культуры айчыннымідаследчыкамі (П.К. Банцэвіч, А.У. Свечнікава, Т.Ф. Сухоцкая, В.Ф. Таланцава, І.М. Шумская і інш.).

Выяўленне сацыякультурнай сутнасці музея ў працах айчынных культуролагаў (Т.А. Джумантаева, Я.А. Кавалёў, Я. Л. Краснова, І.Г. Лупашка).

## Тэма 7. Станаўленнеі развіццё сістэмы культуралагічнай адукацыі ў Беларусі

Культуралогія як вучэбная дысцыпліна. Культуратворчая і навуковая дзейнасць навукоўцаў Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі, Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута і Мінскага інстытута культуры (Г.І. Барышаў, М.М. Грынчык, Р. Б. Смольскі, Ю. М. Чурко, В. Л. Яканюк і інш.). Афармленне навуковых цэнтраў па даследаванні праблем тэорыі і гісторыі культуры, падрыхтоўцы культуралагічных кадраў: БДУ, БДУКМ, Інстытут культуры Беларусі, Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы, Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы.

Развіццё вышэйшай культуралагічнай адукацыі ў Беларусі. Паслядыпломная культуралагічная адукацыя і яе формы: магістратура, аспірантура, дактарантура.

Манаграфічная і вучэбна-метадычная літаратура, аўтарамі якой з’яўляюцца беларускія культуролагі.

Перыядычныя выданні па праблемах тэорыі і гісторыі культуры: часопісы, зборнікі навуковых матэрыялаў.

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

| Назва раздела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | КСР | форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|
| | лекцыі | семінарскія заняткі | | |
| ***Уводзіны*** | 1 | | | |
| *Тэма 1.* Гістарычныя і сацыяльныя перадумовы станаўлення імпліцытных ведаў аб культуры | 2 | 1 | 1 | ВА |
| *Тэма 2.* Пераасэнсаванне сутнасці культуры мысліцелямі Беларусі ў XVII–XVIII стст. | 2 | 1 | 1 | ТЭСТ |
| *Тэма 3.* Узнікненне новых навуковых галін даследавання беларускай культуры ў XIX – пач.XX ст. | 2 | 2 | | |
| *Тэма 4.* Фарміраванне экспліцытных культуралагічных ведаў у першай палове XX ст. | 2 | 2 | 1 | ВА |
| *Тэма 5.* Фундаментальныя даследаванні артэфактаў беларускай культуры ў апошняй чвэрціXX ст. | 2 | 2 | 1 | ВА |
| *Тэма 6.* Развіццё навуковага патэнцыялу сучаснай беларускай культуралагічнай школы | 2 | 1 | 1 | ВА |
| *Тэма 7.* Станаўленне і развіццё сістэмы культуралагічнай адукацыі ў Беларусі | 3 | 1 | 1 | ПА |
| **Усяго…** | **16** | **10** | **6** | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*


1. *Грыгаровіч, Я.Д.* Прыкладная культуралогія: вучэб. дапам. для студэнтаў спецыяльнасці «культуралогія» ўстаноў, якія забяспечваюць атрыманне вышэйшай адукацыі / Я. Д. Грыгаровіч, А. І. Смолік. – Мінск: Адукацыя і выхаванне, 2005. – 228 с.

2. *Конан, В.М.* Проблемы искусства и эстетики в общественной мысли Белоруссии начала XX в. / В.М. Конан. – Минск : Наука и техника, 1985. – 200 с.

3. *Крукоўскі, М.І.* Філасофія культуры: уводзіны ў тэарэтычную культуралогію: вучэб дапам. / М. І. Крукоўскі. – Мінск: Універсітэцкае, 2000. – 192 с.

4. *Падокшын, С.А.* Філасофская думка эпохі Адраджэння ў Беларусі: ад Францыска Скарыны да Сімяона Полацкага / С. А. Падокшын ; навук. рэд. А. С. Майхровіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1990. – 283 с.

5. *Смолік, А. І.* Гісторыя беларускай культуралагічнай думкі : вучэб. дапам. /А.І.Смолік, Л.К.Кухто; М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск: БДУКМ, 2014. – 236 с.

6. *Смолік, А.І.* Беларуская культуралогія: гісторыя і сучаснасць / А.І. Смолік; М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск: БДУКМ, 2014. – 276 с.


*Дадатковая*


1. *Кравкин, В. И.* Гносеология культуры (К постановке проблемы) / В.И. Кравкин // Искусство и культура. – 2011. – № 1. – С. 107–117.

2. Культурология: учебник для студ. учреждений высш. проф. образования / К. Г. Антонян[и др.] ; под ред. Л. М. Мосоловой. – М.: Изд. центр «Академия», 2013. – 352 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3. *Смолик, А.И.* Белорусская культурология как научная дисциплина: становление и развитие / А.И. Смолик // Искусство и культура. – 2011. – № 1. – С. 83–89.

4. *Сцепанцоў, А.І.* Сістэма бесперапыннай адукацыі ў галіне культуры / А.І. Сцепанцоў // Мастацкая адукацыя і культура. – 2004. – № 3. – С. 13–19.

5. *Языкович, В.Р.* Культурология: учеб.-метод. пособие / В. Р. Языкович. – РИВШ, 2010. – 364 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Метады і тэхналогіі навучання

Да эфектыўных педагагічных методык і тэхналогій, якія садзейнічаюць далучэнню студэнтаў да пошуку і выкарыстання ведаў, набыцця вопыту самастойнага вырашэння праблем сацыякультурнай практыкі, адносяцца:

– тэхналогіі праблемна-модульнага навучання;
– тэхналогіі вучэбна-даследчай дзейнасці;
– праектныя тэхналогіі;
– камунікатыўныя тэхналогіі;
– гульнявыя тэхналогіі;
– метад аналізу канкрэтных сітуацый.

Для кіравання вучэбным працэсам і арганізацыі кантрольна-ацэначнай дзейнасці выкладчыкам рэкамендуецца выкарыстоўваць рэйтынгавыя, крэдытна-модульныя сістэмы ацэнкі вучэбнай і даследчай дзейнасці студэнтаў, варыятыўныя мадэлі кіруемай самастойнай работы, вучэбна-метадычныя комплексы.

У мэтах фарміравання неабходнай сацыяльна-асобаснай і сацыяльна-прафесійнай кампетэнтнасці выпускніка УВА ў практыку правядзення семінарскіх заняткаў мэтазгодна ўкараняць методыкі актыўнага навучання, дыскусійныя формы.

У якасці аднаго з метадаў выяўлення вучэбных дасягненняў магістранта магчыма выкарыстоўваць крытэрыяльнаарыенціраваныя тэсты. Яны ўяўляюць сабой сукупнасць тэставых заданняў закрытай формы з адным альбо некалькімі варыянтамі правільных адказаў; заданняў на ўстанаўленне адпаведнасці паміж элементамі; заданняў адкрытай формы з фармалізаваным адказам; заданняў на ўстанаўленне правільнай паслядоўнасці.

Для вызначэння адпаведнасці вучэбных дасягненняў магістранта патрабаванням адукацыйнага стандарта таксама магчыма выкарыстоўваць праблемныя, творчыя заданні, якія прадугледжваюць эўрыстычную дзейнасць і нефармалізаваны адказ.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**СТАНАЎЛЕННЕ І РАЗВІЦЦЁ**
**БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРАЛОГІІ**
**ЯК НАВУКІ І ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ**

*Вучэбная праграма па спецыяльнасці*
*1-21 80 13 Культуралогія*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

РэдактарА. А. Ляўкевіч
Тэхнічны рэдактар А. У. Гіцкая

Падпісана ў друк 2016. Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$.
Папераофісная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 0,93. Ул.-выд. арк. 0,55. Тыраж 20 экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнаевыкананне:
Установа адукацыі
«Беларускідзяржаўныўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.